*Генадзь Сагановіч*

# НЕМЦЫ Ў СЯРЭДНЯВЕЧНЫМ ПОЛАЦКУ

Уключэнне Полацка ў склад Вялікага Княства Літоўскага ў гістарыяграфіі традыцыйна звязвалася з выгнаннем немцаў з горада ў пачатку XIV ст. Пры нязначных адрозненнях тлумачэнні гэтай падзеі даўно зводзіліся да наступнай версіі. Пасля смерці апошняга полацкага князя Полацк трапіў у залежнасць ад рыжскага арцыбіскупства, у выніку чаго прыкладна ў 1305 г. у горад наехалі немцы, узвялі касцёл і сталі актыўна ўводзіць каталіцтва. Гэта выклікала супраціў палачан, якія паўсталі і ў 1307 г. паклікалі на дапамогу літоўскага князя Віценя, з чыёй дапамогаю і выгналі немцаў са сваёй зямлі, а касцёл разбурылі. У вызваленым горадзе быў пасаджаны Віценеў сын Воін, і Полацк апынуўся пад уладаю літоўскага князя.

Адным з першых такую версію прапанаваў М. Карамзін[1], затым з падобным тлумачэннем выступіў В. Данілевіч[2], а ў савецкую эпоху пасля сцвярджэнняў аўтарытэтнага савецкага гісторыка Уладзіміра Пашуты[3] яна стала агульнапрызнанай. Прынамсі ў беларускай гістарыяграфіі менавіта так асвятлялася ўключэнне Полацка ў склад ВКЛ на старонках навуковых і папулярных выданняў[4], асабліва ў падручніках па гісторыі краіны[5]. Тое, што Полацк трапіў пад уладу літоўцаў у 1307 г. у выніку выгнання немцаў, было акцэптавана таксама ў замежнай гістарыяграфіі[6].

Між тым, нягледзячы на аксіяматычнасць, гэтая версія не магла не нараджаць сумненняў. Па-першае, не ўсе факты з ёй узгадняліся. Прыкладам, захавалася грамата полацкага епіскапа Якава з 1309 г.[7], адрасаваная рыжскаму біскупу

---

[1] Н. М. Карамзин. *История государства Российского*. Москва, 1988. Кн. 1. Т. 4. С. 100-101.

[2] В. Е. Данилевич. *Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия*. Киев, 1896. С. 152-153.

[3] В. Т. Пашуто. *Образование Литовского государства*. Москва, 1959. С. 392.

[4] С. А. Шчарбакоў. Барацьба беларускага народа супраць нямецкай агрэсіі ў XIII–XIV ст. // *Весці АН БССР. Серыя гуман. навук*. 1966. № 1. С. 66; *Полоцк: Исторический очерк* / Отв. ред. П. Петриков. 2-е изд. Минск, 1987. С. 31; В. Насевіч. *Пачаткі Вялікага Княства Літоўскага: падзеі і асобы*. Мінск, 1993. С. 72.

[5] *Гісторыя БССР. У 5 т.* Мінск, 1972. Т. 1. С. 120; *Нарысы гісторыі Беларусі*: *У 2 ч.* / Гал. рэд. М. Касцюк. Мінск, 1994. Частка 1; *Дапаможнік па гісторыі Беларусі* / Пад рэд. А. Каханоўскага і інш. Мінск, 1995; *Гісторыя Беларусі*. *Дапаможнік для паступаючых у ВНУ* / Пад рэд. Ю. Казакова і інш. Мінск, 1998; *Гісторыя Беларусі*: *У 2 ч.* / Пад рэд. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. Мінск, 1998. Частка 1. С. 88; И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. *История Беларуси с древнейших времен до наших дней*. Минск, 2000. С. 20; *Гісторыя Беларусі*: *У 2 ч.* Мінск, 2000. Частка 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст. Курс лекцый / І. П. Крэнь, І. І. Коўкель, С. В. Марозава, С. Я. Сяльверстава, І. А. Фёдараў. С. 201-202. Прыклады можна множыць і множыць.

[6] M. Hellmann. *Das Lettenland im Mittelalter*. Münster; Köln, 1954. S. 204; Ejusd. *Grundzüge der Geschichte Litauens und litauischen Volkes*. Darmstadt, 1990. S. 19; M. Kosman. *Historia Białorusi*. Wrocław etc., 1979. S. 60.

ды ратманам горада Рыгі, у якой гаворыцца пра мірныя адносіны і паступленні хлеба з Рыгі ў Полацк[8]. З паслання, вынікае, што Полацк у той час, як і Ноўгарад, быў рэспублікай[9]. Князя не было, пытанні агульнага кіравання вырашала веча, а ў міжнародных дачыненнях горад прадстаўляў епіскап. Такога не было б, калі б Полацк у 1307 г. трывала далучылі да ВКЛ, і калі б Віцень пасадзіў там княжыць Воіна. Епіскап Якаў у грамаце піша пра "любоў" рыжан з Віценем, называючы таго "сынам сваім", і параўноўвае яе з "першай любоўю" паміж Рыгай і палачанамі[10]. Гэта зноў пярэчыць версіі пра выгнанне немцаў і захоп Полацка літоўцамі, бо пасля такога канфлікту паміж Віценем і немцамі на "любоў" разлічваць не даводзілася б. З моманту ўключэння Полацкага княства ў ВКЛ закрываўся шлях па Дзвіне як Ордэну, так і каталіцкаму касцёлу[11], што немінуча правакавала б канфлікты.

З дугога боку, і гэта галоўнае, традыцыя звязваць уключэнне Полацка ў ВКЛ з выгнаннем немцаў і датаваць гэтыя падзеі 1305–1307 г. абапіраецца фактычна толькі на адзіны запіс у хроніцы Мацея Стрыйкоўскага, які цьмяна спасылаецца на нейкія "старыя рускія летапісы": "Nalazłem też w starych latopisach Ruskich, z których mam kilko exemplarzów, iż Litwa roku 1307 Połocko wzięła, ale jako i pod kim, nie pisze"[12]. Вера ў праўдзівасць гэтага выказвання Стрыйкоўскага апошнімі гадамі неаднакроць крытыкавалася[13], а нядаўна была прапанавана і разгадка паходжання гэтага запісу: Стрыйкоўскі ўзяў яго ў Альшэўскім спісе кароткай хронічкі ВКЛ, аўтар якога ў сваю чаргу запазычыў інфармацыю з польскіх крыніц, але заблытаўся і звязаў з Полацкам падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Польшчы[14]. Словам, міфічнасць сцвярджэння пра тое, што ў 1307 г. "Літва ўзяла Полацк", канчаткова даказана. Але і думка Генрыха Лаўмяньскага, які лічыў, што летапіснае паведамленне пра ўзяцце Полацка літоўцамі ў 1307 г. у сапраўднасці ёсць адгалоскам падзей 1387 г.[15], калі Скіргайла штурмам авалодаў горадам, каб паланіць Андрэя Альгердавіча, якому дапамагалі абараняцца немцы, таксама не пацвярджаецца.

Паўстае пытанне, калі ж у сапраўднасці ў Полацку маглі быць немцы, і калі "першая любоў" палачан з імі скончылася выгнаннем апошніх?

Спецыялістам вядомы дакументы пачатку XIV ст., якія непасрэдна сведчаць пра факт існавання нямецкага каталіцкага асяродка ў найстарэйшым беларускім горадзе. Гэта скарга на Інфлянцкі ордэн з боку рыжскага арцыбіскупа Фрыдрыха

---

[7] *Полоцкие грамоты* (далей – *ПГ*) / Сост. А. Н. Хорошкевич. Москва, 1980. Вып. 3. С. 123.
[8] *Russische-Livländische Urkunden* (далей – *RLU*) / Hg. v. C. E. Napiersky. Sankt-Petersburg, 1868. № 38. C. 20; *ПГ*. Москва, 1977. № 3. Вып. 1. С. 37.
[9] Тамсама. С. 126.
[10] *ПГ*. Вып. 1. С. 37.
[11] M. Hellmann. *Das Lettenland im Mittelalter*… S. 205.
[12] M. Stryjkowski. *Kronika Polska, Litewska, Żmudzka i wszystkiej Rusi*. Warszawa, 1846. T. 1. S. 349.
[13] Г. Сагановіч. Інфлянцкія немцы ў Полацку ў сярэдзіне XIII і пачатку XIV ст. // *Беларускі Гістарычны Агляд* (далей – *БГА*). 2000. Т. 7. Сш. 1(12). С. 97-105; А. Селарт. Полацкі князь Канстанцін і гісторыя Інфлянтаў у трэцяй свэрці XIII ст. // *БГА*. 2004. Т. 11. С. 23-24.
[14] В. Варонін. "Wielkiego Księstwa Litewskiego Kroniczka krotko pisana" // *БГА*. 2004. Т. 11. С. 40-50.
[15] Г. Ловмяньский. Роль рыцарских орденов в Прибалтике (XIII–XIV вв.) // *Польша и Русь. Черты общности и своеобразия в историческом развитии Руси и Польши XII – XIV вв*. Москва, 1974. Спас. 13.

ад 14 верасня 1305 г.[16], пасланне папы Клеменса V ад 19 чэрвеня 1310 г.[17] з падобнай скаргай на Ордэн, і самае важнае – паказанні сведак інквізіцыйнага працэсу супраць братоў Нямецкага ордэна ў Інфлянтах, праведзенага папскім капеланам Францыскам Мальянскім у Рызе ў 1312 г.[18]

У скарзе арцыбіскупа Фрыдрыха фон Перштайна размова вядзецца пра "замак Полацк" (*castrum Plozk*), які належаў да Рыжскай арцыбіскупіі, але Ордэн страціў яго на карысць няверных, як страціў і Дынабург, прададзены рыцарамі за 300 марак[19].

У буле рымскага папы ад 19 чэрвеня 1310 г., якая пісалася на падставе абвінавачванняў, дасланых у Рым, таксама фігуруе Полацк, дакладней *Regnum Polochense*: "Полацкае каралеўства, якое некалі полацкі кароль, не маючы нашчадкаў, навярнуўшыся на веру Хрыстовую, ахвяраваў рыжскай кафедры для збавення сваёй душы", рыцары Інфлянцкага ордэна "саступілі згаданым паганым не без страты вялікай колькасці верных. З той прычыны дзве прыгожыя кафедры, а менавіта ў Селоніі і ў Русі, што знаходзіліся ў названым каралеўстве, былі аддадзены поўнаму знішчэню..."[20].

У апошнім дакуменце ў 14-м пункце сёмага сведкі цыстэрыянскага святара Генрыха з кляштара ў Фалькенаў (Эстонія) сярод іншага гаворыцца: "Калі кароль Полацка і яго падданыя былі навернутыя ў хрысціянства, і меліся біскупы, і прэлаты, і іншыя духоўныя, згаданых падданых так прыгняталі браты Ордэна, што тыя паклікалі на дапамогу паганых, якія з'явіліся, названых братоў каго прагналі, каго пабілі, каго паланілі, у выніку чаго і ўспомнены кафедральны касцёл быў разбураны"[21]. І ў іншых паказаннях з "вялікага працэсу" Ордэну інкрымінуецца, што ён саступіў паганым (г. зн. літоўцам) "Полацкае каралеўства"[22].

Трэба адзначыць, што на падставе гэтых жа крыніц ў гістарыяграфіі з'явілася яшчэ адна версія далучэння Полаччыны да ВКЛ, менш пашыраная. Згодна ёй, літоўцы ў 1307 г. купілі Полацк у нямецкіх рыцараў, атрымаўшых горад у падарунак ад бяздзетнага полацкага князя. Адным з першых такі погляд выказаў М. Карамзін, які спаслаўся на булу папы Клімента V ад 19 чэрвеня 1310 г. і твор Адама Нарушэвіча[23]. Паказальны факт: сам акт продажу горада гісторык аднёс да 1307 г. толькі таму, што пад гэтым годам у Стрыйкоўскага "Літва Полацк узяла". Гэтаксама В.Данілевіч прызнаваўся, што "захоп" Полацка літоўцамі ён датаваў 1307 г., бо арыентаваўся на тую ж звестку Стрыйкоўскага[24], і з гэтай датай звязаны

---

[16] *Liv-, Est- und Curlandisches Urkundenbuch* (далей – *LUB*) / Hrsg. v. F. G. v. Bunge. Reval, 1855. Bd. 2. Nr. 616. S. 24-31. Regesten 710.
[17] *LUB*. Bd. 2. Nr. 630, Regesten 714; *Preussisches Urkundenbuch* (далей – *PUB*). Bd. II/1. Nr. 13. S. 7-9.
[18] U Niess. *Hochmeister Karl von Trier (1311–1324).* Marburg, 1992. S. 78-82. Тэкст пратаколу рэканструяваў і надрукаваў А. Серафім. Гл.: A. Seraphim. *Das Zeugenverhör des Franciscuc de Moliano (1312). Quellen zur Geschichte des Deutschen Ordens.* Königsberg, 1912.
[19] *LUB*. Bd. 2. Nr. 616. S. 27.
[20] *LUB*. Bd. 2. Nr. 630. S. 50; *PUB*. Bd. II/1. Nr. 13. Гл. таксама ў Яна Длугаша. J. Długosz. *Roczniki czyli Kronika sławnego królewstwa Polskiego*. Warszawa, 1975. Ks. 9. S. 96.
[21] A. Seraphim. *Das Zeugenverhör des Franciscuc* ...S. 164, 169.
[22] Ibid. S. 200, 202 ff.
[23] Н. Карамзин. *История государства* ...С. 100-101.
[24] В. Данилевич. *Очерк истории Полоцкой земли* … С. 154.

развагі пра куплю Полацка ў М. Баўмгартэна[25]. Між тым, у папскім дакуменце, на які спасылаецца М. Карамзін, не сказана канкрэтна пра продаж Полацка[26]. Размова можа ісці хутчэй пра продаж Дзюнабурга, а не Полацка, хоць і першае праблематычна. З адказаў пракуратара Ордэна ў 1306 г. вынікала, што рыцары адбудавалі замак Дзюнабург, але паганцы напалі і разбурылі яго[27]. Калі б літоўцы купілі замак, то не было б сэнсу нападаць і бурыць яго. Вядома, што Дзюнабург ляжаў у запусценні пасля разбурэнняў, пакуль у 1312 г. магістр Ордэна не адбудаваў цвердзь на новым месцы, ніжэй па Дзвіне, на адлегласці 19 км ад старога горада[28].

Такім чынам, адхіляючы версію куплі-продажу, можна прызнаць, што працэсуальныя дакументы згодныя ў адным: Полацк трапіў у залежнасць ад інфлянцкіх немцаў і рыжскага касцёла, а потым з віны Ордэна ім авалодалі літоўцы. На жаль, цытаваныя крыніцы не ўтрымліваюць ніякай інфармацыі для датавання апісаных падзей. Аднак з іх кантэксту вынікае, што тое, аб чым гаворыцца, адбылася даўно. Прыкладам, у даручэнні папы Клімента V спецыяльнай камісіі па следству згадваецца полацкі кароль, які "некалі" прыняў лацінскую веру і ахвяраваў свае ўладанні рыжскай кафедры[29]. Зразумела, што адбывацца гэта магло ніяк не ў 1305 г., якім датавана першая апеляцыя рыжскага арцыбіскупа, а намнога раней. Канкрэтным пацвярджэннем даўнасці справы можна лічыць фразу ў адказе ордэнскага пракуратара на скаргу арцыбіскупа: у 1306 г. ён напісаў, што, як Літоўскае ды Земгальскае біскупства "гадоў сто і болей ва ўладзе паганцаў", так і кафедра ў Полацку ўжо "гадоў сто і болей ва ўладзе русінаў"[30]. Невыпадкова і В. Данілевіч у сваёй спецыяльнай працы па сярэднявечнай гісторыі Полаччыны прыйшоў да высновы, што літоўскі князь, які прыняў каталіцтва і завяшчаў Полацк немцам, валодаў гэтым горадам не ў пачатку XIV, а ці ў другой палове XIII ст., ці "хутчэй за ўсё ў яго трэцяй чвэрці"[31]. А польскі літуаніст Г. Лаўмяньскі лічыў, што ў буле папы Клімента V гаворыцца ў сапраўднасці пра падзеі часоў Міндоўга[32].

Па гісторыі Полацка другой паловы XIII ст., якую з-за недахопу крыніц можна без перабольшвання назваць таямнічай, надзвычай важным дакументам з'яўляецца мірны дагавор паміж Полацкам і Віцебскам, з аднаго боку, і Рыгай ды магістрам Інфлянцкага ордэна, з другога, напісаны ад імя князя Гердзеня і датаваны 28 снежня 1264 г.[33]. У гэтым дакуменце, выдадзеным у Рызе, пацвярджаюцца (ці

---

[25] N. Baumgarten. Polotzk et la Lithuanie // *Orientalia Christiana Periodica*. Roma, 1936. Vol. 2. P. 241-242.
[26] *LUB*. Bd. 2. Nr. 630. S. 50.
[27] *LUB*. Bd. 2. Reg. Nr. 714.
[28] M. Hellmann. *Das Lettenland im Mittelalter*... S. 206.
[29] *LUB*. Bd. 2. Nr. 630. S. 50.
[30] *LUB*. Bd. 2. Regesten 714.
[31] В. Данилевич. *Очерк истории Полоцкой земли* … С. 152.
[32] H. Łowmiański. Początki i rola polityczna zakonów rycerskich nad Bałtykiem w wieku XIII i XIV // Ejusd. *Prusy – Litwa – Krzyżacy* / Oprac. M. Kosman. Warszawa, 1989. S. 445.
[33] *RLU*. № 25. S. 13; *LUB*. Bd. 6. № 3036; *ПГ*. Вып. 1. № 1. С. 35-36. Большасць даследчыкаў адносіла гэтую грамату да канца 1263 г., і хоць у публікацыі Г. Харашкевіч яна таксама датавана 1263 г., даследчыца піша пра магчымасць адносіць дакумент і да 1264 г. (Гл.: *ПГ*. Вып. 3. С. 116-117), што падаецца больш верагодным. Праўда, эстонскі даследчык схільны адносіць яе да 1363 г. Гл.: А. Селарт. Полацкі князь Канстанцін... С. 15-16.

ўзнаўляюцца) ўмовы ранейшага дагавора нейкага князя Канстанціна: палачане і віцябляне абавяцаюць "...не въступатися на тую землю, што князь Костянтинъ дал местерю съ своею братьею", а за гэта магістр і браты-рыцары мусілі "...отступити с всею правдою" ад Полацкай зямлі. Факт даравання зямель полацкім князем Канстанцінам па просьбе Ордэна пацвердзіла була папы Урбана IV ад 20 жніўня 1264 г.[34] У папскім пасланні ёсць інфармацыя, што полацкі князь перадаў Ордэну замак Розітэн (Рэзекнэ) з землямі, г. зн. свае ўладанні ў Паўночнай Латгаліі.

Грамата Гердзеня дэкларавала пераход ад канфліктаў ("пакости", якая тварылася ў час "розмирья" паміж Рыгай і Полацкам, а ёй мог быць і паход 1262 г. на Дэрпт) да ранейшых мірных адносінаў і свабоды гандлю. "А старому миру стояти", – гаворыцца ў дакуменце. Гэты сказ даў падставу Г. Харашкевіч пісаць, што раней, яшчэ да "размір'я", з немцамі магчыма падпісваўся нейкі папярэдні, "стары мір" Гердзеня[35]. Магчыма, аднак слова "мір" тут магло і не азначаць мірнага дагавора, а выкарыстоўвацца ў сваім першасным значэнні "спакою", "стану мірных адносін"[36].

Хоць грамата сыходзіць ад Гердзеня, як заўважыў яшчэ М. Баўмгартэн[37], з тэкста дакумента не вынікае, што менавіта ён быў полацкім князем, як лічылі некаторыя гісторыкі[38]. Гердзень толькі ручаецца за выкананне прадугледжаных дагаворам умоў і абяцае, што ягоныя наступнікі таксама паклапоцяцца пра гэта. На чыста пасярэдніцкую ролю Гердзеня звярталі ўвагу таксама М. Гельман[39], так і Г. Харашкевіч, якая падкрэсліла, што няма ніякіх падстаў называць яго полацкім князем на момант пісання гэтай граматы[40]. Сапраўды, Гердзень не быў полацкім князем, таму летапісцы ніколі і не звязвалі яго з Полацкам. І паход Даўмонта супраць Гердзеня ў 1267 г. быў скіраваны не на Полацк, а на Літву[41].

Наступным важным дакументам, напісаным у Полацку неўзабаве пасля граматы Гердзеня, стала "Слова" князя Ізяслава[42], якое з'яўляецца гандлёвым пагадненнем Полацка і Віцебска з Рыгай і магістрам Інфлянцкага ордэна. У тэксце падкрэсліваецца, што Полацк знаходзіцца ў цесным саюзе з Віцебскам ("Полотескъ Видьбескъ одно есть"), у якім таксама сядзіць князь Ізяслаў, і пацвярджаецца данацыя князя Канстанціна: "Чего ся есме отступили в Ризе, к тому вамъ не приискывати...". Апелюючы да добрай практыкі першых полацкіх уладароў, князь Ізяслаў фармулюе прынцып вольнага гандлю з немцамі, вядомы з часоў княжання Ўладзіміра Васількавіча: "Полочаном видьбляномъ волное торгованье въ Ризе, на Готьском берегу и въ Любьце"[43].

---

[34] *LUB*. Bd. 1. Nr. 380. S. 484.
[35] *ПГ*. Вып. 3. С. 114-115.
[36] *Словарь русского языка XI–XVII вв*. Москва, 1982. С. 166.
[37] N. Baumgarten. Polotzk et la Lithuanie. P. 231.
[38] В. Пашуто. *Образование Літовского государства* ... С. 377-387.
[39] M. Hellmann. *Das Lettenland im Mittelalter*… S. 194.
[40] *ПГ*. Вып. 3. С. 115.
[41] Суздальская летопись // *ПСРЛ*. Москва, 1962. Т. 1. Сл. 472; Рогожский летописец // *ПСРЛ*. Москва, 1965. Т. 15. С. 33.
[42] *LUB*. Bd. 6. № 3037; *ПГ*. Вып. 1. № 2. С. 36-37.
[43] *ПГ*. Вып. 1. № 2. С. 36.

Грамата не датаваная, аднак у яе тэксце ёсць словы, якія дазваляюць вызначыць час напісання дакумента: абодва Ізяславы называюцца князямі “*воли Божии и в Молшегове*” (г. зн. па волі Божай і Войшалкавай). Улічваючы, што Войшалк перадаў уладу Шварну за некалькі месяцаў да таго, як у 1267 г. загінуў, дакумент можна адносіць не пазней як да 1266 г. Больш дакладна яго датавала Г. Харашкевіч, аднёсшы грамату да 1265 г.[44] Гэтая ж даследчыца звярнула ўвагу, што для палачан “Слова” Ізяслава стала надзвычай важным дакументам, таму з моманту напісання да пачатку XV ст. яно захоўвалася ў Полацку, ажно пакуль пад час падрыхтоўкі Копускай дамовы арыгінал граматы не перавезлі ў Рыгу[45].

Найверагодней, князь Ізяслаў сядзеў у Полацку і пад час напісання граматы Гердзеня. Імя Ізяслаў было на Русі княскім, і хутчэй за ўсё Ізяслаў належаў да мясцовай, полацкай дынастыі. Зыходзячы з гэтых меркаванняў, М. Баўмгартэн не сумняваўся, што абодва Ізяславічы княжылі ў Полацку і Віцебску пры жыцці Гердзеня[46]. Чаму ж тады снежаньская дамова 1264 г. пісалася ад імя Гердзеня? Магчыма, у Полацку існавала апазіцыя планам канчатковай перадачы Канстанцінавай данацыі Ордэну, таму спатрэбілася падтрымка Гердзеня, які пацвердзіў дамову з магістрам Ордэна і Рыгай як сюзерэн Полацка, ці намеснік Войшалка.

Пытаннем адкрытым, хоць і даўно разгляданым даследчыкамі застаецца ідэнтыфікацыя таямнічага полацкага Канстанціна[47]. У гістарыяграфіі найчасцей з ім атаесамляўся сын Таўцівіла[48]. Нашчадку гэтага полацкага князя на пачатку 1264 г. удалося ўцячы ад Траняты з Полацка ў Ноўгарад Вялікі, дзе ён быў прыняты князем Яраславам Яраславічам. На думку Э. Клюга, які спасылаецца на У. Пашуту, Таўцівілавіч заставаўся ў Ноўгарадзе на службе да канца XIII ст.[49], але гэта малаверагодна. Хутчэй меў рацыю М. Таўбэ, які лічыў, што полацкі ўцякач не затрымліваўся там доўга і неўзабаве перапраівіўся ў Рыгу[50]. Такое дапушчэнне ўскосна пацвярджаецца даследаваннем Г. Харашкевіч, якая паказала, што ўжо ў 1265 г. ноўгарадскі князь заняў рэзка антылітоўскія пазіцыі і скіраваў свой гнеў супраць літоўскіх пасяленцаў у Ноўгарадзе[51], так што і Таўцівілаў сын наўрад ці мог застацца ў баку. Як адзін з военачальнікаў князь Канстанцін (зяць Аляксандра Неўскага) вядомы ў Ноўгарадзе з 1262 г.[52] Ён браў удзел і ў паходзе ноўгарадскага

---

44 Тамсама. С. 36.
45 *ПГ*. Вып. 3. С. 121.
46 N. Baumgarten. Polotzk et la Lithuanie. P. 232.
47 Гл. спецыяльнае даследаванне: А. Селарт. Полацкі князь Канстанцін… С. 3-24.
48 E. Bonnel. Russisch-livländische Chronographie. St. Peterburg, 1862. S. 125; H. Paszkiewicz. *Jegiellonowie a Moskw*a. Warszawa, 1933. T. 1: Litwa a Moskwa w XIII i XIV wieku. S. 107-108; В. Т. Пашуто. *Образование Литовского государства*. С. 382, 385; Д. Феннел. *Кризис средневековой Руси: 1200–1304*. Москва, 1989. С. 172; Л. Войтович. *Удільні князівства Рюриковичів і Гедиміновичів у XII–XVI ст.* Львів, 1996. С. 235 та інш.
49 Э. Клюг. *Княжество Тверское (1247–1485).* Тверь, 1994. С. 67.
50 M. Taube. Internationale und Kirchenpolitische Wandlungen im Ostbaltikum und Russland zur Zeit der deutschen Eroberung Livlands // *Jahrbücher für Geschichte Osteuropas.* 1938. Bd. 3.
51 А. Л. Хорошкевич. Из истории русско-немецких отношений XIII в. // *Исторические записки.* 1965. Вып. 78. С. 223-224.
52 *ПГ*. Вып. 3. С. 122-123.

войска на нямецкі Ракверэ ў пачатку 1268 г.[53], калі ноўгарадцы, дарэчы, спачатку планавалі ісці на Полацк, і невядома з якіх прычын раптам змянілі напрамак паходу. Таму зусім непраўдападобна, каб ён з'яўляўся князем-уцекачом з Полацка. Таўцівілавым сынам хутчэй за ўсё быў князь Аўгуст (ці Айгуст), якога ў 1270 г. Яраслаў Яраславіч даваў Пскову[54]. І Ў. Пашута лічыў, што гэта быў літоўскі князь, які з'яўляўся супернікам Даўмонта[55].

Полацкі князь Канстанцін, найверагодней, паходзіў з полацкай (ці смаленскай) княскай дынастыі[56]. Можна дапусціць, што яго княжанне ў Полацку магло працягвацца ўсяго некалькі месяцаў, якія прыпалі на час паміж забойствам Таўцівіла і жнівеньскай булай папы Урбана IV, г. зн. на першую палову 1264 г. З прыязнасці да немцаў, або хутчэй за ўсё з нейкіх палітычных разлікаў вясной ці летам 1264 г. ён падараваў Нямецкаму ордэну ў Інфлянтах значныя ўладанні ў Паўночнай Латгаліі. Папа Урбан IV па просьбе Ордэна 20 жніўня 1264 г. пацвердзіў гэтую данацыю[57]. У выніку практычна ўся Ўсходняя Латгалія, залежная раней ад Полацка, *de jure* перайшла ва ўласнасць Ордэна. Яшчэ праз некалькі месяцаў умовы даравання былі пацверджаны мірным дагаворам Полацка і Віцебска з магістрам і Рыгай (снежаньская грамата Гердзеня 1264 г.). Калі данацыю Канстанціна спатрэбілася пацвярджаць, значыць перад гэтым яе ўмовы парушаліся ці наогул ставіліся пад сумненне. Выходзіць, землі, падараваныя полацкім князем, тады яшчэ лічыліся спрэчнымі, і Ордэн дамагаўся юрыдычных гарантыяў на іх валоданне. Магчыма, такую сітуацыю ствarала суперніцтва Ордэна з рыжскім арцыбіскупствам. Такую актыўнасць Ордэна ў адносінах з Полацкам можа тлумачыцца таксама імкненнем кампенсаваць страту магчымасцяў развіцця ўплыву на рэгіён, звязаных са смерцю ахрышчаных князёў Міндоўга і Таўцівіла[58].

Такім чынам, у 1264 г. палачане адмовіліся ад сваіх уладанняў ва Ўсходняй Латгаліі, якія князь Канстанцін падараваў немцам, а немцы за гэта паабяцалі не ўмешвацца ў справы Полацка, што было праз год пацверджана і граматай Ізяслава. Калі ўлічыць, што і Гердзень, і князь Ізяслаў рабілі стаўку на мір з Рыгай, можна дапускаць, што пры іх полацка-інфлянцція адносіны не псаваліся сур'ёзнымі канфліктамі. Але невядома, ці доўга княжыў у Полацку Ізяслаў пасля 1265–1266 г.

Храналагічна з'яўленне новага князя на полацкім стале лагічна звязваць з пераездам полацкага епіскапа Сімеона (прадстаўніка полацкага княскага роду) ў Цвярское княства. Вядома, што, карыстаючыся падтрымкай цвярскога князя Яраслава Яраславіча, які займаў уладзіміра-суздальскі стол, ён заснаваў у Цверы другую пасля растоўскай кафедру Паўночна-Ўсходняй Русі. Праз нейкі час пас-

---

[53] *Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов* (далей – *НПЛ*) / Ред. А. Насонов. Москва; Ленинград, 1950. С. 85-86.
[54] *НПЛ*. С. 321.
[55] В. Т. Пашуто. *Образование Литовского государства*. С. 387.
[56] У гэтым пытанні мне падаецца цалкам слушнай пазіцыя эстонскага гісторыка. Гл. А. Селарт. Полацкі князь Канстанцін... С. 19-20.
[57] *RLU*. № 24.
[58] M. Hellmann. *Das Lettenland im Mittelalter*. S. 187.

ля гэтага епіскап Сіміяон наведваў Полацк, дзе меў размову з князем – нейкім Канстанцінам Бязрукім, у выніку якой і з’явілася яго “Павучанне”[59].

Пры набожным Войшалку ці Гердзені[60] полацкі епіскап наўрад ці пакідаў бы сваю кафедру. Падштурхнуць да гэтага Сіміяона магло б з’яўленне новага князя ці нешта зусім непрымальнае для праваслаўнага ўладыкі, прыкладам, пашырэнне ўлады рыжскага арцыбіскупа на яго епіскапства. Нямецкі гісторык Э. Клюг схільны звязваць гэтыя падзеі з перыядам 1267–1271 г.[61], а У. Кучкін адносіць з’яўленне Канстанціна ў Полацку да 1267–1268 г., але памылкова атаесамляе яго з сынам Таўцівіла[62]. Найверагодней, гэта быў канец 1260-х г. – час, які папярэднічаў прыходу на вялікакняскі пасад Трайдзеня. Праўдападобна таксама, што Канстанцін Бязрукі быў тым самым Канстанцінам, які падараваў Ордэну землі Ўсходняй Латгаліі, бо і таго, і другога вызначае пранямецкая пазіцыя. Пра яго палітыку красамоўна сведчыць ліст рыжскага магістрата да віцебскага князя Міхаіла Канстанцінавіча (1280–1290-я гады), у якім сцвярджаецца, што пад час княжання яго бацькі Канстанціна нямецкім купцам не было на што скардзіцца, бо тады захоўваўся мір і пільнаваліся ўмовы вольнага гандлю[63]. Полацкага Канстанціна як дабрадзея нямецкіх рыцараў згадваюць і ордэнскія дакументы XIVст.[64] Выглядае, Канстанцін Бязрукі з’яўляўся акурат той асобай, якая магла паставіць Полацк пад уладу Рыгі ці павялічыць прысутнасць немцаў у горадзе, чым і была выклікана такая рэакцыя епіскапа Сіміяона.

Такім чынам, падсумоўваючы, можна прапанаваць наступную версію. Так званая “першая любоў” Полацка з немцамі хутчэй за ўсё была звязана з кароткім княжаннем Канстанціна і яго данацыяй. Грамата Гердзеня 1264 г. зафіксавала ўжо некаторае ўскладнне адносін. Яе ўмовы пакідалі каталіцкае біскупства ў Полацку – калі дапусцім, што яно там існавала – на волю лёсу. Пазней, дарэчы, і гэта магло стаць падставай для абвінавачванняў Ордэна ў тым, што той прывёў да краху нямецкую каталіцкую місію ў Полацку і дапусціў да разбурэння пабудаванага там каталіцкага храма. Аднак, як сведчаць дакументы, і Гердзень, і полацкі князь Ізяслаў рабілі стаўку на мір з Рыгай і Ордэнам. Добрыя адносіны з Інфлянтамі захоўваў і Вайшалк. Да драматычнай развязкі магло дайсці пазней, у выніку другога княжання Канстанціна, перыяд якога (канец 1260-х гадоў) па ўсёй верагоднасці і стаў часам найбольшага збліжэння з немцамі ды іх усталявання ў Полацку. Развязка, у якой мелі месца і падзеі, апісаныя ў пратаколе “вялікага працэсу” супраць Ордэна, наступіла, відаць, пасля змены ўладара ў літоўскай манархіі і на полацкім пасадзе. Новы князь, які заняў пасад пасля Канстанціна Бязрукага, мог быць пасажаны

[59] В. А. Кучкин. Особая редакция “Наказания” Симеона Тверского // *Изучение русского языка и источниковедение*. Москва, 1969. С. 243-250.

[60] Гердзеню, жанатаму з русінкай Еўпраксіяй, хрысціянства таксама не было варожым. Яго сын пад імем Андрэй пасля Сімеона стаў другім цвярскім епіскапам. В. А. Кучкин. *Повесть о Михаиле Тверском*. С. 253.

[61] Э. Клюг. *Княжество Тверское*... С. 67.

[62] В. А. Кучкин. Особая редакция “Наказания”... С. 244.

[63] *LUB*. Bd. 6. Nr. 3059.

[64] *Die Statuten des Deutschen Ordens nach den ältesten Handschriften* / Hg. v. M. Perlbach. Halle, 1890. S. 132.

Трайдзенем, добра вядомым сваёй варожасцю да немцаў. Заняўшы вялікакняскі стол пасля забойства Шварна, г. зн. у канцы 1269 ці ў 1270 г.[65], Трайдзень у тым жа годзе разграміў Ордэн у бітве пад Каруза і заставаўся паслядоўнікам антынямецкай палітыкі. Магчымасці збліжэння Полацка з Ордэнам, пра якое так часта згадвалася ў нямецкіх дакументах XIV ст., у такіх умовах выключаліся б.

Слабасцю такога тлумачэння загадкавых звестак з дакументаў рыжскага інквізіцыйнага працэсу супраць Ордэна з'яўляецца мноства гіпатэтычных дапушчэнняў і ўмоўнасцях. Аднак пры той беднасці верагодных гістарычных крыніц, якая характарызуе мінулае Полацка сярэдзіны – другой паловы XIII ст., даследчыку не застаецца іншага спосабу працы. Звязная ж версія, нават калі хутка выявіцца яе памылковасць, дазваляе ўключаць у контур разумення і падзеі, захутаныя глыбокім змрокам даўніны.

[65] М. Грушевський. Хронольогія подій Галицько-Волинської літописи // *ЗНТШ*. Львів, 1901. Т. 41. Кн. 3. С. 47.